79
Й18

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 930.253(476)(043)

**Іванова**
**Вольга Сяргееўна**

# АСАБІСТЫЯ АРХІВЫ Ў СКЛАДЗЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АРХІЎНАГА ФОНДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**АЎТАРЭФЕРАТ**
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 05.25.02 – дакументалістыка, дакументазнаўства, архівазнаўства (гістарычныя навукі)

Навукова-
бібліяграфічны
аддзел
Навукова-
бібліяграфічны
аддзел
Установа адукацыі
Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П.М.Машэрава
БІБЛІЯТЭКА

Мінск, 2009

79.33(4Бен)я031
ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік — **Шумейка Міхаіл Фёдаравіч**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Афіцыйныя апаненты: **Менькоўскі Вячаслаў Іванавіч**, доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта

**Скалабан Віталь Уладзіміравіч**, кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела публікацыі дакументаў ДУ "Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь"

*20504127*

Апаніруючая арганізацыя: УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

Абарона адбудзецца 28 мая 2009 г. у 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.05 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасу: 220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, ауд. 407. Тэл. вучонага сакратара 8 (017) 227–45–11.
e-mail: menkovski@bsu.by

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы «___» красавіка 2009 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый,
доктар гістарычных навук, дацэнт — В.І. Менькоўскі

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

# КАРОТКІЯ УВОДЗІНЫ

Антрапалагізацыя гістарычнай навукі, як аднаго з накірункаў гуманітарных ведаў, што пачалася ў другой палове XX ст., зрабіла актуальным пытанне "ачалавечання" архівазнаўства. Архівы ў шырокім разуменні пачалі разглядацца як сродак рэалізацыі патрэбнасці чалавека ў захаванні памяці аб сваім існаванні, дзейнасці, культуры, традыцыі і іх перадачы наступным пакаленням. Асабісты архіў, комплекс дакументаў, які фарміруецца па прынцыпу адносінаў да жыцця і дзейнасці адной асобы, мае цэнтрам увагі чалавека праз прызму светаўспрымання якога дакументальна фіксуецца гістарычная рэчаіснасць. Гісторыя, рэканструяваная на падставе індывідуальных сведчанняў паўстае суб'ектыўнай, прапаноўвае нетрадыцыйны погляд на вядомыя факты і адкрывае новыя тэматычныя накірункі даследаванняў. Адсюль вынікае неабходнасць комплекснага захавання найбольшай колькасці сведчанняў аб асобе, якія канцэнтруюцца ў асабістым архіве. Аднак на практыцы цэласнасць асабістага архіва парушаецца ў выніку дзеяння шэрагу фактараў: гістарычных падзей, стаўлення асобы і грамадства да неабходнасці захоўвання, неадпаведных умоў захоўвання і інш.

З пачатку 1990-х гг. пошук новых крыніц і метадаў у асвятленні падзей гісторыі і ролі асобы ў фарміраванні нацыянальных каштоўнасцей, з'яўляецца актуальным у працы і дыскусіях беларускіх гісторыкаў, архівістаў, працаўнікоў музеяў і бібліятэк. У 2005 г. па ініцыятыве Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ), вядучай архіўнай установы, якая захоўвае дакументы асабістага паходжання, была праведзена канферэнцыя "Архівы асабістага паходжання – састаўная частка інфармацыйнага рэсурсу грамадства", значным дасягненнем стала таксама стварэнне "Метадычных рэкамендацый да працы архіваў з дакументамі асабістага паходжання".

Адносіны асобы і грамадства да захоўвання дакументальнай спадчыны прадстаўнікоў нацыянальнай эліты з'яўляюцца пэўным індыкатарам культурнага і духоўнага ўзроўню. Так, нямецкі паэт І. Гётэ за 10 год да смерці, пачаў упарадкаванне асабістага архіва, пазней унесенага ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЭСКА. Клапаціліся пра захаванне сваіх архіваў расійскія паэты і пісьменнікі А. Пушкін, А. Герцэн, М. Агароў, польскі генерал Г. Дамброўскі. Архіўная спадчына выдатных асоб захоўваецца ў мемарыяльных музеях розных краін свету: Гандзі – у Індыі, Карнеля і Флабера – у Францыі (Руан), Гётэ і Гейнэ – у Германіі (Дюсельдорф), Дзікенса, Кейта, Дарвіна – у Велікабрытаніі (Лондан) і інш.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

На сённяшні дзень, асабістыя архівы – гэта адна з важнейшых складовых частак інфармацыйнага рэсурса беларускага грамадства. Яны захоўваюцца як у прыватнай уласнасці, так і ў складзе архіваў, музеяў і бібліятэк Рэспублікі Беларусь. Праблемы фарміравання, пошуку, захоўвання і выкарыстання асабістых архіваў, што вывучаюцца у межах архівазнаўства, выступаюць асноўнымі працэсамі, якія характарызуюць іх як частку Нацыянальнага архіўнага фонда (НАФ) Рэспублікі Беларусь, якая да сучаснага моманту не атрымала ўсебаковай ацэнкі.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь тэмы з буйнымі навуковымі праектамі і тэмамі.** Тэма адпавядае навукова-даследчыцкай праблематыцы кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, якая спецыялізуецца на вывучэнні праблем крыніцазнаўства, гістарыяграфіі, метадаў гістарычнага даследавання, а таксама архівазнаўства і дакументазнаўства. Дысертацыйная праца выканана ў рамках тэмы "Тэарэтычныя і метадычныя праблемы беларускай археаграфіі і архівазнаўства ў XIX – пачатку XXI ст.", што распрацоўваецца ў межах Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў "Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры" на 2006–2010 гг. (№ 20061338, 5 чэрвеня 2006 г.).

**Мэта і задачы даследавання**

Мэта працы – ахарактарызаваць сучасны стан і вызначыць асноўныя тэндэнцыі ў працэсе фарміравання, захоўвання і выкарыстання асабістых архіваў як складовай часткі НАФ Рэспублікі Беларусь.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

1. акрэсліць спецыфіку асабістага архіва ў параўнанні з іншымі комплексамі дакументаў асабістага паходжання на падставе гістарыяграфічнага даследавання;

2. сабраць і сістэматызаваць дадзеныя аб захаваных асабістых архівах дзеячаў беларускай навукі, культуры, грамадска-палітычнай і інш. сфер дзейнасці;

3. вызначыць і ахарактарызаваць асноўныя тэндэнцыі ў гісторыі фарміравання, захоўвання і выкарыстання асабістых архіваў як часткі НАФ Рэспублікі Беларусь;

4. выявіць сучасныя праблемы дзяржаўных сховішчаў Беларусі ў сферы камплектавання, захоўвання і выкарыстання дакументаў асабістых архіваў, прапанаваць шляхі іх вырашэння;

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

5. распрацаваць методыку навуковай рэканструкцыі асабістых архіваў.

У якасці **аб'екта** даследавання выступаюць асабістыя архівы грамадска-палітычных дзеячаў, дзеячаў навукі, культуры і інш. **Прадмет** – сучасны стан іх захоўвання і выкарыстання, а таксама гісторыя фарміравання НАФ Рэспублікі Беларусь у частцы асабістых архіваў.

Асабістыя архівы, як самастойныя комплексы дакументаў адной асобы, вылучаюцца ў гісторыі архіўнай справы, пачынаючы з XVIII ст., калі з развіццём навукі і культуры дзейнасць вучонага і творцы пачала разглядацца як пэўная з'ява, а яго дакументы, як культурнае і духоўнае багацце. Развіццё архіўнай справы на беларускіх землях з XVIII ст. прайшло некалькі этапаў: канец XVIII–пач. XX ст., 1918–1941, 1941–1945, 1945–1991 і з 1991, якія адпавядаюць агульнай перыядызацыі гісторыі Беларусі і выкарыстоўваюцца як храналагічныя рамкі для даследавання праблемы фарміравання НАФ Рэспублікі Беларусь у частцы асабістых архіваў. Канец XVIII–пачатак XX ст. – перыяд калі беларускія землі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай увахodзілі ў склад Расійскай імперыі і не вызначаліся як самастойная дзяржаўная адзінка, якая стварае ўласную цэнтралізаваную сістэму захоўвання архіўных дакументаў. У гэты час адбываецца фарміраванне комплексаў дакументаў асабістага паходжання (фамільных, сядзібных, сямейных, асабістых архіваў), якія пасля 1918 г. паступова ўключаюцца ў склад ДАФ БССР (СССР), заснаванага на прынцыпе цэнтралізацыі.

Закон "Аб НАФ і архівах у Рэспубліцы Беларусь" 1994 г. (у рэдакцыі 1999 г.), дае падставы разглядаць асабістыя архівы, як складовую частку архіўнай спадчыны беларускага грамадства, што захоўваецца ў дзяржаўных сховішчах і ў прыватнай уласнасці, а таксама за межамі рэспублікі і патрабуе пэўнага вывучэння. Асабістыя архівы якія адносяцца ці могуць быць аднесены да НАФ Рэспублікі Беларусь – гэта архівы асоб, што нарадзіліся ў Беларусі, асоб, якія ўсведамлялі сябе беларусамі ці зрабілі ўнёсак у развіццё беларускай навукі, культуры і іншых сфер дзейнасці, шляхам стварэння мастацкіх і навуковых твораў на беларускай мове ці аб Беларусі, удзелам ў беларускіх грамадскіх і палітычных арганізацыях і інш.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Асабісты архіў, як комплекс дакументаў, што адносяцца да жыцця і дзейнасці адной асобы, разглядаецца зыходзячы з архівазнаўчага прынцыпа прыналежнасці (пертыненцыі). Асаблівасцямі асабістага архіва, якія абумовілі яго спецыфіку ў параўнанні з іншымі комплексамі дакументаў асабістага паходжання, з'яўляюцца: уключэнне ў склад

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ
асабістага архіва пасмяротных дакументаў, дакументаў членаў сям'і, калекцый; наяўнасць у складзе розных тыпаў крыніц і груп дакументаў; захоўванне фрагментаў аднаго асабістага архіва ў фондах і калекцыях дзяржаўных сховішчаў і ў прыватнай уласнасці; практычная немагчымасць захавання асабістага архіва ў яго цэласнасці. Асабістыя архівы – аб'ект даследавання, які адкрывае магчымасці для комплекснай ацэнкі грунтоўнай часткі НАФ Рэспублікі Беларусь і вырашэння шырокага спектра архівазнаўчых, крыніцазнаўчых і гісторыка-культурных праблем, звязаных з працэсамі іх фарміравання, збірання, захоўвання і выкарыстання.

2. Электронная база дадзеных (БД) "Асабістыя архівы" утрымлівае інфармацыю аб больш як 1200 асабістых архівах дзеячаў беларускай навукі, культуры і грамадска-палітычнай сферы, уключаючы біяграфічныя звесткі, дадзеныя аб гісторыі і стане захоўвання асабістых архіваў у дзяржаўных сховішчах Беларусі і іншых краін, характарыстыку складу дакументаў. БД дазваляе правесці аналіз стану захоўвання асабістых архіваў і тэматычны пошук інфармацыі ў адпаведнасці з накірункам дзейнасці ўтваральніка, стварыць даведнік па дакументах асабістага паходжання, якія захоўваюцца ў замежных сховішчах і з'яўляюцца патэнцыяльнай крыніцай для папаўнення НАФ Рэспублікі Беларусь, адчыняе магчымасці для ўвядзення ў навуковы зварот грунтоўнага комплекса крыніц.

3. Асноўныя тэндэнцыі ў збіранні, захоўванні і выкарыстанні асабістых архіваў вызначаюцца ў межах агульнагістарычных працэсаў і характарызуюцца дамінаваннем пэўных формаў і метадаў захоўвання, ступенню ўсведамлення прадстаўнікамі інтэлігенцыі неабходнасці зберажэння творчай і навуковай спадчыны асобы. У канцы XVIII–пач. XX ст. з шэрагу комплексаў дакументаў асабістага паходжання пачалі вылучацца асабістыя архівы, якія пасля смерці ўладальнікаў, як правіла, захоўваліся ў расійскіх і польскіх прыватных калекцыях і зборах, а таксама грамадскіх і дзяржаўных установах. 20–40-я гг. XX ст. – гэта пачатак прыёму архіваў асабістага паходжання на захоўванне ў дзяржаўныя архівы, музеі і бібліятэкі як часткі ДАФ БССР, арганізацыі прадстаўнікамі беларускай інтэлігенцыі іх збірання ў прыватных музеях, архівах і калекцыях. У пасляваенны час фарміруецца цэнтралізаваная сістэма камплектавання дзяржаўных сховішчаў асабістымі архівамі, ствараецца навукова-метадычная база для іх захоўвання, значна пашыраецца навуковае выкарыстанне, ажыццяўляецца пошук асабістых архіваў дзеячаў беларускай навукі і культуры за межамі Беларусі.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

4. Раскіданасць дакументаў адной асобы па розных сховішчах, адсутнасць комплекснай інфармацыі аб захоўванні, нездавальняючыя ўмовы навукова-тэхнічнай апрацоўкі і нізкая інфарматыўная каштоўнасць шэрагу комплексаў дакументаў у некаторых сховішчах, адсутнасць дадзеных аб частках асабістых архіваў у замежных сховішчах, неашчаднае стаўленне грамадства да дакументаў – асноўныя праблемы захоўвання і выкарыстання асабістых архіваў на сучасным этапе. Іх вырашэнне вымагае цеснага навукова-метадычнага супрацоўніцтва паміж рэспубліканскімі, абласнымі, занальнымі і ведамаснымі архівамі, аддзеламі рукапісаў бібліятэк, музеямі, у якіх, па праведзеных падліках, захоўваецца больш 600 фондаў асабістага паходжання, малакалькасныя архівы больш 440 асоб у складзе 67 калекцый. Стварэнне рэспубліканскага каардынацыйнага цэнтра, увядзенне адзіных правілаў уліку, захоўвання і выкарыстання дакументаў асабістага паходжання ў адпаведнасці з законам аб НАФ і на аснове распрацаваных беларускімі архівістамі метадычных рэкамендацый – найбольш эфектыўныя шляхі пераадолення выяўленых недахопаў.

5. Методыка рэканструкцыі асабістых архіваў, заснаваная на архівазнаўчым метадзе рэканструкцыі збораў, скіравана на ўзнаўленне як мага больш цэласнага комплекса дакументаў зыходзячы іх прыналежнасці да дзейнасці адной асобы, на падставе вывучэння гісторыі яго фарміравання і складу, захаваўшыхся рэшткаў, шляхам сістэматызацыі і характарыстыкі асноўных груп дакументаў, складання вопіса рэканструяванага архіва, ацэнкі характару архіва і панесеных страт. Рэканструкцыя асабістага архіва І. Грыгаровіча, адзінага з захаваўшыхся ў Беларусі архіваў вучоных XIX ст. дазволіла ахарактарызаваць дадзены архіў як асобны гісторыка-культурны феномен, ацаніць паўнату захаваўшыхся фрагментаў і панесеныя страты. Дадзеная методыка спрыяе ўвядзенню ў навуковы зварот новых крыніц і падыходаў да іх выкарыстання ў даследаваннях, забяспячэнню доступа да інфармацыі аб дакументах у незалежнасці ад месца іх фізічнага знаходжання, адчыняе магчымасці для ўдасканалення прыёмаў навуковага апісання асабістых архіўных фондаў.

**Асабісты уклад суіскальніка**

Прадстаўленая дысертацыя – гэта самастойнае аўтарскае даследаванне, вывады і палажэнні якога з'яўляюцца вынікам працы, цалкам выкананананай суіскальнікам. У працэсе працы быў сабраны, вывучаны, сістэматызаваны і прааналізаваны вялікі эмпірычны матэрыял, на падставе дакументаў, якія захоўваюцца ў дзяржаўных сховішчах Беларусі і іншых дзяржаў. Гэта дало магчымасць раскрыць адну з

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

актуальных праблем беларускага архівазнаўства: даць комплексную ацэнку каштоўнасці асабістых архіваў, як адной з частак НАФ Рэспублікі Беларусь, – а таксама прадставіць інфармацыю аб новых крыніцах шырокаму колу даследчыкаў. Даследаванне было праведзена з улікам навейшых навуковых дасягненняў архівазнаўства.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні дысертацыі знайшлі адлюстраванне ў публікацыях аўтара і апрабіраваны ў рамках шэрагу рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцый, прысвечаных актуальным праблемам архівазнаўства, дакументазнаўства, крыніцазнаўства, археаграфіі, метадалогіі гістарычных даследаванняў: 1. 6 кастрычніка 2003, БДАМЛМ, І архіўныя чытанні "БДАМЛМ – скарбніца культурна-духоўнай спадчыны Беларусі", даклад на тэму "Коллекция И.И. Григоровича в БГАМЛИ: состав документов и особенности научного описания"; 2. 12 мая 2005, Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы (БелНДІДАС), круглы стол, прысвечаны 60-годдзю перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, даклад на тэму "Личные фонды и коллекции в государственных архивах Республики Беларусь как источник по истории Великой Отечественной войны"; 3. 5 кастрычніка 2005, БДАМЛМ, ІІІ архіўныя чытанні "Падзеі Першай Сусветнай вайны на Беларусі ў дакументах беларускіх архіваў", даклад на тэму "История первой мировой войны в документах личных фондов и коллекций Белорусского государственного архива-музея литературы и искусства"; 4. 14 снежня 2005, БелНДІДАС, архіўныя чытанні, прысвечаныя 75-годдзю з дня нараджэння Р.П. Платонава, даклад на тэму "Личные фонды в государственных архивах Республики Беларусь: проблемы комплектования и использования"; 5. 23–25 лютага, 2006, БДУ, гістарычны факультэт, міжнародная навуковая канферэнцыя "Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX–XXI стст." Да 100-годдзя з дня нараджэння М.М. Улашчыка, даклад на тэму "Личный архив Н.Н. Улащика: источниковедческий анализ"; 6. 26–27 кастрычніка 2006, Інстытут гісторыі НАНБ, міжнародная навуковая канферэнцыя "Праблемы метадалогіі даследаванняў Беларусі", даклад на тэму "Асабістыя архівы як аб'ект гісторыка-крыніцазнаўчага вывучэння (структура і метады даследвання)"; 8. 12 красавіка 2007, БелНДІДАС, навукова-практычная канферэнцыя "Сучасныя праблемы дакументазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі". Да 85-годдзя Дзяржаўнай архіўнай службы і 80-годдзя Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, даклад на тэму "Асабістыя архівы ў Латвійскіх сховішчах як крыніца па гісторыі Беларусі"; 8. 28 верасня 2007,

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

БелНДІДАС, круглы стол "Праблемы гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі ў Беларусі" (да 60-годдзя з дня нараджэння праф. У.М. Міхнюка), даклад на тэму "Асабістыя архівы як гістарычная крыніца: класіфікацыя і крыніцазнаўчая вартасць"; 9. 23 мая 2008, Кіеўскі нацыянальны універсітэт культуры і мастацтваў, другі міжнародны навукова-практычны семінар "Термінологія документознавства та суміжних галузей знань", даклад на тэму "Проблемы эволюции дефиниций в архивоведении (на примере комплексов документов личного происхождения)".

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Вынікі даследавання прадстаўлены ў 16 артыкулах у навуковых выданнях і зборніках матэрыялаў канферэнцый, агульным аб'ёмам 107 старонак (5,5 аўтарскія аркушы), з іх 4 апублікаваны ў выданнях, унесеных у спіс ВАК Рэспублікі Беларусь.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Структура і аб'ём дысертацыі абумоўлены мэтай і задачамі даследавання. Дысертацыя складаецца з пераліку скарачэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і дадаткаў. Поўны аб'ём дысертацыі – 190 старонак, у тым ліку бібліяграфічны спіс на 40 старонках, 6 дадаткаў на 50 старонках. Бібліяграфічны спіс ахоплівае 466 найменняў крыніц і літаратуры і 16 публікацый аўтара. Тры главы дысертацыі прысвечаны аналізу крыніц, літаратуры і метадаў даследавання, гісторыі фарміравання і характарыстыцы сучаснага стану захоўвання асабістых архіваў як часткі НАФ Рэспублікі Беларусь.

## АГУЛЬНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

### Глава 1 "Гістарыяграфія, крыніцы і метады даследавання"

У раздзеле **1.1 "Азначэнне паняцця "асабісты архіў""** на аснове аналіза тэарытычных, нарматыўна-метадычных і гістарычных прац савецкіх, польскіх, беларускіх, украінскіх, расійскіх архівазнаўцаў былі выдзелены асноўныя характэрныя рысы асабістага архіва ў параўнанні з іншымі комплексамі дакументаў асабістага паходжання, разгледжана эвалюцыя дадзенага паняцця ў архівазнаўстве. Неабходнасць правядзення тэрміналагічнага даследавання абумоўлена асаблівасцямі грамадска-палітычнага і культурнага развіцця розных краін, наяўнасцю разыходжанняў у азначэннях у розныя часы. Асабісты архіў характарызуецца з пункту гледжання архівазнаўчага прынцыпа прыналежнасці (пертыненцыі), вызначаюцца асноўныя накірункі і

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы


1. Иванова, О.С. К вопросу о систематизации документов фонда № 6 (Коллекция Григоровичей) в БГАМЛИ / О.С. Иванова // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 4. / рэд. кал. У.І. Адамушка [і інш.] – Мінск, 2003. – С. 47–54.
2. Иванова, О.С. «Находка» третьего тома «Белорусского архива» И. Григоровича в БГАМЛИ / О.С. Иванова // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 5. / рэд. кал. У.І. Адамушка [і інш.] – Мінск, 2004. – С. 29–34.
3. Іванова, В. Дакументальная спадчына протаіерэя Іаана Грыгаровіча / В. Іванова // Праваслаўе. – 2004. – № 12–13. – С. 78–85.
4. Иванова, О.С. Проблемы и перспективы работы с личными фондами в государственных архивах Республики Беларусь / О.С. Иванова // Архівы і справаводства. – 2006. – № 4. – С. 89–96.
5. Іванова, В. Грыгаровіч Іван Іванавіч / В. Іванова // Архівісты Беларусі: Біябібліяграфічны даведнік / склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка – Мінск, 2006 – С. 15–16.
6. Іванова, В. Змест і эвалюцыя паняцця “асабісты архіў” / В. Іванова // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 8. / рэд. кал. У.І. Адамушка [і інш.] – Мінск, 2007. – С. 55–67.


### Матэрыялы канферэнцый


7. Иванова, О.С. Коллекция И.И. Григоровича в БГАМЛИ: состав документов и особенности научного описания / О.С. Иванова // Архіўныя чытанні І–ІІІ: матэрыялы навуковых канферэнцый, Мінск, 2003–2005 гг. / укл. Г.В. Запартыка [і інш.]; навук. рэд. А.В. Мальдзіс – Мінск, 2006. – С. 28–30.
8. Иванова, О.С. История Первой мировой войны в документах личных фондов и коллекций Белорусского государственного архива-музея литературы и искусства / О.С. Иванова // Архіўныя чытанні І–ІІІ: матэрыялы навуковых канферэнцый, Мінск, 2003–2005 гг. / укл. Г.В. Запартыка [і інш.]; навук.рэд. А.В. Мальдзіс – Мінск, 2006. – С. 190–194.
9. Иванова, О.С. Личные архивные фонды и коллекции как источник по истории Великой Отечественной войны (по материалам архивов Республики Беларусь) / О.С. Иванова // Быў подзвіг. І была перамога: матэрыялы архіўн. чытанняў, прысвеч. 60-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчынай вайне (Мінск, 12 мая 2005) / адк. рэд. Ю.У. Несцяровіч, У.В. Фядосаў – Мінск, 2006 – С. 111–117.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

10. Иванова, О.С. Личные фонды в государственных архивах Республики Беларусь: проблемы комплектования и использования / Иванова, О.С. // Мінулае павінна служыць людзям...: матэрыялы архіўных чытанняў «Р.П. Платонаў і пытанні архівазнаўства, археаграфіі, крыніцазнаўства і гісторыі Беларусі XX ст.» (Мінск, 14 снежня 2005 г.) прысвеч. 75-годдзю з дня нараджэння Р.П. Платонава / адк. рэд. Ю.У. Несцяровіч, У.В. Фядосаў – Мінск, 2006. – С. 29–34.
11. Іванова, В. Асабістыя архівы ў Латвійскіх сховішчах як крыніца па гісторыі Беларусі / В. Іванова // Сучасныя праблемы дакументазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі: матэрыялы навук.-практ. канф., прысвеч. 85-годдзю Дзярж. архіўн. службы і 80-годдзю Нац. архіва Рэсп. Беларусь. (Мінск, 12 красавіка 2007) / склад. В.С. Пазднякоў, П.П. Журкевіч. – Мінск, 2007. – С. 162–168.
12. Іванова, В. Лісты з асабістага архіва Івана Грыгаровіча / В. Іванова // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 8. / рэд. кал. У.І. Адамушка [і інш.] – Мінск, 2007. – С. 222–231.
13. Иванова, О.С. Личный архив Н.Н. Улащика и его источниковедческий анализ / О.С. Иванова // Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX–XXI стст. у Беларусі: зб. навук. артыкулаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М.М. Улашчыка / рэдкал. С.М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.] – Мінск, 2007. – С. 23–30.
14. Іванова, В.С. Асабісты архіў як гістарычная крыніца: класіфікацыя і інфарматыўная вартасць / В.С. Іванова // Праблемы гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі ў Беларусі: матэрыялы “круглага стала”, прысвеч. 60-годдзю з дня нараджэння праф. У.М. Міхнюка (Мінск, 28 верас. 2007 г.) / склад. В.С. Пазднякоў, П.П. Журкевіч; навук. рэд. У.І. Адамушка, А.Я. Рыбакоў. – Мінск, 2008. – С. 47–54.
15. Іванова, В. Асабістыя архівы як аб’ект гісторыка-крыніцазнаўчага вывучэння / В. Іванова // Проблемы методологии исследований истории Беларуси: материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 26–27 окт. 2006 г.)/ Нац. акад. наук Беларуси, Институт истории; редкол. А.А. Коваленя [и др.] – Минск, 2008.– С. 244–246.
16. Иванова, О. Проблемы эволюции дефиниций в архивоведении (на примере комплексов документов личного происхождения) / О. Иванова // Термінологія документознавства та суміжних галузей знань: зб. наук. праць / В.В. Бездрабко; Київський нац. ун-т культури і мистецтв; Інститут державного управління и права. – Київ, 2008. – Вип. 2. – С. 108–116.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## РЭЗЮМЕ

**Іванова Вольга Сяргееўна**

**Асабістыя архівы ў складзе Нацыянальнага архіўнага фонда Рэспублікі Беларусь**

**Ключавыя словы:** асабісты архіў, архівазнаўства, Нацыянальны архіўны фонд, дзяржаўныя архівы, музеі, бібліятэкі, фарміраванне, камплектаванне, захоўванне, выкарыстанне, рэканструкцыя.

**Мэта даследавання** – характарыстыка сучаснага стану і вызначэнне асноўных тэндэнцый у працэсе фарміравання, захоўвання і выкарыстання асабістых архіваў як складовай часткі НАФ Рэспублікі Беларусь.

**Метады даследавання.** Даследванне заснавана на прынцыпах гістарызму, аб'ектыўнасці і сістэмнасці, пры з выкарыстанні агульнанавуковых метадаў (аналіза і сінтэза, індукцыі і дэдукцыі, ідэалізацыі, абагульнення) агульнагістарычных метадаў (гісторыка-сістэмнага, гісторыка-генетычнага, гісторыка-тыпалагічнага), колькасных метадаў, спецыяльных метадаў асобных дысцыплін (архівазнаўства, крыніцазнаўства, сацыялогіі, псіхагісторыі і інш.).

**Навуковая навізна.** Упершыню зроблена спроба комплекснай ацэнкі асабістых архіваў як часткі НАФ Рэспублікі Беларусь, і часткі інфармацыйнага рэсурса беларускага грамадства. Ахарактарызаваны асноўныя тэндэнцыі ў працэсе фарміравання НАФ Рэспублікі Беларусь у частцы асабістых архіваў. Прааналізаваны колькасныя і якасныя паказчыкі стану камплектавання, захоўвання і выкарыстання асабістых архіваў у дзяржаўных сховішчах Беларусі на сучасным этапе, вызначаны ключавыя праблемы і прапанаваны падыходы для іх вырашэння. Сабрана інфармацыя аб гісторыі і стане захоўвання больш як 1200 асабістых архіваў, прапанавана методыка іх навуковай рэканструкцыі, акрэслены асноўныя накірункі выкарыстання дакументаў асабістых архіваў у навуковых даследаваннях.

**Практычная значнасць.** Вынікі работы маюць практычную значнасць у працы архіваў, музеяў і бібліятэк Беларусі, якія захоўваюць дакументы асабістага паходжання; для стварэння даведніка па асабістых архівах і пошуку неабходнай інфармацыі пры правядзенні навуковых даследаванняў, а таксама могуць быць выкарыстаны ў вучэбным працэсе.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

# РЕЗЮМЕ

**Иванова Ольга Сергеевна**

## Личные архивы в составе Национального архивного фонда Республики Беларусь

**Ключевые слова:** личные архивы, архивоведение, Национальный архивный фонд, государственные архивы, музеи, библиотеки, формирование, комплектование, хранение, использование, реконструкция.

**Цель исследования** – характеристика современного состояния и основных тенденций в процессе формирования, хранения и использования личных архивов как составной части НАФ Республики Беларусь.

**Методы исследования.** Исследование проводилось в соответствии с принципами историзма, объективности и системности, при использовании общенаучных (анализа и синтеза, индукции и дедукции, обобщения, идеализации), общеисторических (историко-системного, историко-генетического, историко-типологического), количественных методов, специальных методов отдельных дисциплин (архивоведения, источниковедения, социологии, психоистории и др.).

**Научная новизна.** Впервые сделана попытка комплексной оценки личных архивов как части НАФ Республики Беларусь и как части информационного ресурса беларусского общества. Охарактеризованы основные тенденции в процесе формирования НАФ в части личных архивов. Проанализированы количественные и качественные показатели состояния комплектования, хранения и использования личных архивов в государственных хранилищах Беларуси на современном этапе, определены основные проблемы и предложеия для их решения. Собрана информация об истории и состоянии хранения более 1200 личных архивов, предложена методика их реконструкции, охарактеризованы основные направления возможного использования документов личных архивов для научных исследований.

**Практическая значимость.** Результаты работы могут иметь практическое значение в работе архивов музеев и библиотек Беларуси, для создания справочника по личным архивам и поиска информации для научных исследований, а также могут быть использованы в учебном процессе.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## SUMMARY

**Ivanova Olga Sergeevna**

## Personal archives as a part of National archival fond of the Republic of Belarus

**Key words:** personal archives, archival study, the National archival fond, state archives, museums, libraries, formation, acquisition, custody, retention, reconstruction of personal archives.

**Purpose of the research** – to characterize the main streams in the history of acquisition of the National archival fond with the personal archives and the modern situation of their custody and retention.

**Methods of the research.** The research is founded on the principles of historical, system method and objectivity. The complex of universal scientific methods (analysis and synthesis, deduction and induction, generalization, analogy), historical methods (historical-genetic, historical-typological, historical-comparative) and special methods of some disciplines (archival studies, source studies, sociology, psychological history etc.) were used.

**Scientific novelty.** For the first time personal archives as a part of the National archival fond of the Republic of Belarus were complexly assessed. The main streams in the process of the formation of the National archival fond in the part of personal archives were characterized. The analysis of the quality and quantity of the personal archives' acquisition, custody and retention in the state depositories were given, the proposals of solving the problems and personal archives using were made. The information about more than 1200 personal archives were accumulated.

**Practical application.**The results of the work can be used in the practical work of the archives, museums and libraries of Belarus, for the creation of the guide, searching for the information for the scientific investigations and in the studying process.

